УДК 39:[398.3:398.332.4](476.7)

# ТРАНСФАРМАЦЫЯ ФУНКЦЫІ І СЕМАНТЫКІ КАЛЯДНАЙ АБРАДНАСЦІ ЗАХОДНЯГА ПАЛЕССЯ


***І. В. Хамутова,***

*саіскальнік вучонай ступені кандыдата навук установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*



**Анатацыя.** У артыкуле разгледжана трансфармацыя каляднай абраднасці на сучасным этапе яе бытавання. Вылучаны наступныя асноўныя фактары ўздзеяння: пераход ад язычніцтва да хрысціянства, глабалізацыя, умацаванне масавай культуры праз сродкі камунікацыі і ўздзеянне мясцовых супрацоўнікаў дамоў культуры, адыход ад міфалагічнага мыслення. У сучасных вёсках Заходняга Палесся назіраецца трансфармацыя спосабаў вырабу абрадавай атрыбутыкі і абрадавага адзення. Семантыка непасрэдна абрадавай дзеі змяняецца і нават адбываецца пераход абрадавых дзей у гульню, якая мае для мясцовых жыхароў рэкрэатыўную функцыю.



**Ключавыя словы:** Заходняе Палессе, калядная абраднасць, трансфармацыя, семантыка, функцыя, народны карнавал.


# TRANSFORMATION OF THE FUNCTION AND SEMANTICS OF THE WEST POLESIE CAROLING RITUALISM


***I. Khomoutova,***

*Competitor of a Scientific Degree of Candidate of Sciences of the Educational Institution «The Belarusian State University of Culture and Arts»*



**Abstract.** The article considers transformation of caroling ritualism at the modern stage of its existence. The main influences are: the transition from paganism to Christianity, globalisation, the strengthening of mass culture through the means of communication and the influence of local staff of houses of culture, the escape from mythological thinking. In modern villages of the West Polesie there is a transformation of the ways of manufacturing ceremonial attributes and ceremonial clothing. The semantics of the ritual action is changing. There is a transition of the ritual action into a game that has a recreational function for local residents.



**Keywords:** the West Polesie, caroling ritualism, transformation, semantics, function, folk carnival.

З цягам часу адбываецца трансфармацыя семантычных кодаў каляднай абраднасці. Вялікі ўплыў на гэта зрабіў пераход ад язычніцтва да хрысціянства. Украінская даследчыца Н. Кавальчук адзначае, што славянская культура знаходзіцца на стыку дзвюх рэлігійных сістэм – язычніцкай і хрысціянскай [2, с. 105]. На тэрыторыі Заходняга Палесся народныя традыцыі пераплятаюцца з хрысціянскімі вераваннямі. Пры апытанні інфармантаў дастаткова распаўсюджана, што жыхары вёскі перад Раством ідуць у царкву ці, радзей, у касцёл, і лічаць абавязковым здзейсніць хрэсны ход, а ўжо з раніцы на наступны дзень пачынаеццца святкаванне ў адпаведнасці з язычніцкімі каранёвымі традыцыямі (абыход двароў каляднікамі, варожбы і г. д.).

Аднак старадаўнія язычніцкія сэнсы каляднага абыходу двароў з цягам часу губляюццца. Яшчэ ў 1960-х гг. З. Я. Мажэйка ў сваім артыкуле адзначыла, што ў побыце сучаснай палескай вёскі Каляда – любімая зімовая гульня, свайго роду карнавал, які ў аднолькавай ступені захоплівае моладзь і людзей сталага ўзросту [3, с. 127], што сведчыць аб тым, што абрадавыя дзеі здзяйсняюцца не з мэтай пераадолення крызісу і павароту сонца на новы віток, а са зменай міфалагічнага светасузірання на рацыянальнае мысленне. Адбылася трансфармацыя функцыі і зместу абрада калядавання, калі калядны абыход двароў, у першую чаргу, мае рэкрэатыўную функцыю. Вельмі яскрава трансфармацыя прасочваецца ў песенай традыцыі. В. Задарожны звяртае ўвагу, што велічальна-віншавальны матыў у некаторых песнях паступова трансфармуецца ў прашальна-віншавальны, што, напрыклад, асабліва яскрава праяўляецца ў калядцы «Настала радасць новая» [1, с. 72]. Менавіта на прыкладзе гэтай папулярнай калядкі, вядома ж, літаратурнага паходжання з царкоўных і рэлігійных колаў В. Задарожны прасочвае яе далейшую эвалюцыю, але на прыкладзе ўкраінскіх варыянтаў яе бытавання [Там жа]. Аднак дадзеная тэндэнцыя прасочваецца і на Заходнім Палессі, асабліва ў дзіцячым калядаванні.

Як адзначалася вышэй, калядны час – час варожбы. Аднак пры апытаннях носьбітаў традыцыі ў 2021–2023 гг. сустракаюцца і супрацьлеглыя кропкі гледжання, калі яны адзначаюць, што ў Каляды на Раство існуе забарона на варожбы і магію, што, безумоўна, звязана з уздзеяннем хрысціянскай маралі.

На трансфармацыю непасрэдна калядных абрадавых комплексаў і, безумоўна, іх семантыкі паўздзейнічаў той факт, што вялікую ролю ў арганізацыі і правядзенні калядавання сталі адыгрываць супрацоўнікі мясцовых дамоў культуры. У Замшанах (Маларыцкі раён) мясцовыя ўдзельнікі каляднага абыходу двароў нават не называюць дзеянне абрадам, а вызначаюць як «тэатральнае ўяўленне “Калядныя хадакі”» (2023 г.), аднак пры гэтым каляднікі выконваюць традыцыйныя мясцовыя калядкі і тэксты-пажаданні з захаваннем дыялектычных асаблівасцей.

Важную ролю іграе і трансфармацыя абрадавых атрыбутаў. Калі раней асноўнымі матэрыяламі для вырабу каляднай зоркі служылі прыродныя матэрыялы (на Заходнім Палессі распаўсюджана традыцыя вырабу каляднай зоркі з саломы), то ў XXI ст. вельмі часта можна сустрэць калядныя зоркі, упрыгожаныя рознакаляровай гірляндай, што, безумоўна, яскрава, але выбіваецца з традыцыйнай культуры і трансфармуецца з унікальнай лакальнай з'явы ва ўніфікаваную рэч глабальнага плана, без арыентацыі на лакальную экалогію. Пры гэтым, нягледзячы на змены матэрыялаў для вырабу з надыходам глабалізацыі, калядная зорка захоўвае сваё семантычнае значэнне.

Адзенне калядоўшчыкаў таксама трансфармавалася. Нажаль, не заўжды абрадавыя маскі вырабляюцца адпаведна традыцыі. Сустракаюцца і набытыя ў крамах. Касцюм казы дастаткова распаўсюджана вырабляецца з сінтэтычнай поўсці, калі раней выкарыстоўваўся кажух, вывернуты поўсцю наверх, што, акрамя вонкавага падабенства з казой, яшчэ мела семантычнае значэнне – перавёрнутае адзенне сімвалізавала хаос, які пануе ў калядны час, і яднанне свету жывых і памерлых.

Аднак, нягледзячы на вонкавую трансфармацыю абраду калядавання, захоўваецца дагэтуль сацыяльная семантычная інфармацыя, якая мае архаічныя карані.

Пры гэтым, калі калядоўшчыкі заходзяць на двор і велічаюць гаспадара, то ў сучасным разуменні носьбітамі традыцыі гэта з'яўляецца камунікатыўным актам з суседзямі, аднавяскоўцамі. Выкананне шчадроўкі, з якой заходзяць на двор, можа залежыць і ад гаспадароў, іх характара, што сведчыць аб тым, што ў сучаснасці шчадроўка адрасуецца не трансцэндэнтным моцам, а непасрэдна рэальным адрасатам – гаспадару і гаспадыні.

Ваджэнне казы, яе паміранне і пераражджэнне на сучасным этапе бытавання пераўтварылася ў гульню-паказ, якую неабходна праіграць кожны год на дабрабыт і шчасце ў доме, таму калядоўшчыкаў заўсёды сустракаюць з ахвотай. Захавалася традыцыя, згодна з якой калядоўшчыкі не заходзяць на двор да гаспадароў, у каго на працягу года хтосьці з сваякоў памёр, і яны выпалі на год з каляндарнага святочнага кола.

Прашальна-віншавальныя матывы стала захоўваюцца. Аднак у сучаснасці гаспадары адорваюць калядоўшчыкаў дарамі не з мэтай ахвярадаўства, а з функцыяй падзякі за наведванне з каляднай гульнёй-паказам.

Падводзячы высновы, неабходна адзначыць, што семантычныя коды ў каляднай абраднасці трансфармуюцца з надыходам агульнай адукаванасці і, зразумела, з прыходам рацыянальнага мыслення, якое выціскае міфалагічную свядомасць мясцовага насельніцтва. Магічныя звароты ў песнях да трансцэндэнтных сіл замяшчаюцца на рэальных адрасатаў (суседзяў, сваякоў) у велічальных і прашальна-віншаваль-

ных матывах. Выраб абрадавай атрыбутыкі таксама падвяргаецца трансфармацыі, але семантыка захоўваецца. Вобразы маскіраваных змяняюцца, аднак у некаторых лакальных мікразонах Заходняга Палесся семантычнае значэнне кожнага з персанажаў захоўваецца. Тым не менш, насупраць, калядныя вобразы ў іншых лакальных традыцыях Заходняга Палесся губляюць сваю першапачатковую семантыку і пераўтвараюцца ў народны карнавал.

1. *Задорожний, В.* Еволюція народної релігійної колядки в новітній час / В. Задорожний // Нар. творчість та етнографія. – 2004. – № 1/2. – С. 69–75.

2. *Ковальчук, Н.* Трансформація християнських уявлень у традиційній календарній обрядовості поліщуків (історико-етнографічний аспект проблеми на прикладі Волинського Полісся) / Н. Ковальчук // Нар. творчість та етнографія. – 2007. – № 2. – С. 105–112.

3. *Можейко, З. Я.* Коляда в белорусском полесском селе / З. Я. Можейко // Совет. этнография. – 1969. – № 3. – С. 127–135.